# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА А. Я. БЕЛАХВОСЦІКАВА



**А. Я. Белахвосцікаў, кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

ліпень 1941 г. – лістапад 1943 г.

**Месца дзеяння:**

пас. Стадыённы і цэнтр г. Віцебска

**Колькасць:**

25 чалавек

**Кіраўнікі:**

Белахвосцікаў Аляксандр Яфімавіч

Дзейнічала ў цэнтры горада і ў пасёлку Стадыённы з ліпеня 1941 г. да лістапада 1943 г. Пачала стварацца яшчэ да акупацыі. Кіраўнік А. Я. Белахвосцікаў («Альдэмар») быў прызначаны на гэтую работу рашэннем гаркама ЛКСМБ. Група амаль 2 гады працавала без правалаў. Аб’ядноўвала 25 чалавек, у тым ліку М. А. Раманенка, П. С. Шлякава, М. С. Баброва, Л. А. Сянкевіч, В. А. Аляксандрава, К. С. Шчуплікава, В. Пахомава, М. Я. Белахвосцікава, С. Ц. Шалаева, І. Ф. Бязбогіна, Г. Я. Фёдарава, А. П. Пахомаву (маці В. Пахомава, суседка Белахвосцікавых), А. Д. Шапурава, С. Р. Раманенка, І. Ф. Ткачова і інш. Намеснікамі кіраўніка ў яго адсутнасць былі В. Пахомаў і М. Я. Белахвосцікава.

У 1942 г. А. Я. Белахвосцікаў атрымаў патэнт і адкрыў бляшаную майстэрню, якая стала штаб-кватэрай падпольнай групы. Пад выглядам рамонту гаспадарчага посуду падпольшчыкі і сувязныя прыходзілі да Белахвосцікава, прыносілі сюды савецкія газеты, лістоўкі, медыкаменты, узрыўчатку, абменьваліся разведінфармацыяй, намячалі планы дзеяння.

Майстэрня знаходзілася на вуліцы Леніна, у двары, за дамамі, мела выхад да стромкага берага Віцьбы, што дазваляла падпольшчыкам незаўважна перамяшчацца. Больш за тое яна месцілася недалёка ад канторы, якой падпарадкоўвалася. Белахвосцікаў, калі ішоў на работу ці з работы, мог кожны дзень назіраць за плошчай, будынкам гарадской управы, за вуліцамі Леніна, Талстога і Суворава, кінатэатрам «Спартак», які наведвалі толькі нямецкія салдаты. Па вуліцы Леніна часта рухаліся ў бок Суража пяхота і тэхніка праціўніка, накіроўваліся на працу супрацоўнікі СД і паліцыі, канваіраваліся ў турму і на допыт патрыёты Віцебска.

Да вясны 1942 г. група дзейнічала пад кіраўніцтвам даваеннага сакратара Чыгуначнага райкама КП(б)Б І. Г. Грыгор’ева, была цесна звязана з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А. Ф. Данукалава), Лёзненскім падпольным райкамам КП(б)Б, армейскай разведгрупай Ю. С. Рудакова («Жоржа», «Ягора»). Праз групу перадавалася каштоўная разведінфармацыя ад А. М. Казлова з в. Сасноўка, дзе размяшчаўся штаб 3-й танкавай арміі ворага. У ноч на 22 лютага 1942 г. падпольшчыкі з дапамогай светлавых сігналаў навялі савецкія самалёты на Смаленскі рынак, дзе была Паступова група павялічвалася. У кожнага яе члена з’яўляліся свае памочнікі, утвараліся новыя падгрупы, якія дзейнічалі самастойна. Аднак у маі 1943 г. патрыёты былі выкрыты правакатарамі і арыштаваны.

5 мая 1943 г. А. Я. Белахвосцікаў, яго сястра Марыя, С. Ц. Шалаеў былі расстраляны каля в. Гарадняны. Некалькі пазней загінулі В. Пахомаў, В. А. Аляксандрава, М. А. Раманенка.

Група працягвала дзейнасць пад кіраўніцтвам П. С. Шлякавай. У яе склад увайшлі В. Ф. Пятроў, Аляксей Ражкоў, Д. А. Сазонаў, Іван Трыфунтаў, Уладзімір Туркін, Г. Я. Фёдараў, Б. Я. Халімановіч, М. І. Шаршнёў, П. С. Шлякава. Былі адпраўлены ў Асвенцім М. Ф. Ткачова і К. С. Шчуплікава.

У Віцебску, на былой 2-й Стадыённай вуліцы, якая цяпер носіць імя А. Я. Белахвосцікава, на доме № 29 у гонар падпольшчыкаў устаноўлена мемарыяльная дошка. А. Я. Белахвосцікаў і яго юны памочнік Валянцін Пахомаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені; медаля «За адвагу» ўдастоены П. С. Шлякава, В. А. Аляксандрава і А. П. Пахомава.




**Мемарыяльная дошка ў гонар падпольшчыкаў Аляксандра Белахвосцікава і Валянціна Пахомава на вул. Белахвосцікава, д. 29 у г. Віцебску**

Крыніца фотаздымкаў: «Віцебская энцыклапедыя»

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група А. Я. Белахвосцікава / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 480–481.

2. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Белахвосцікава А. Я. / Н. І. Дарафеенка, М. У. Дарафеенка // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1990. – С. 131.

3. **Коммунисты** собирают силы // Витебское подполье / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко. – Минск, 1969. – С. 40–56.

4. **Подпольная** группа Белохвостикова А. Е. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 284–285.